# СВЕТАПОГЛЯДНА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ ЗРУХ У БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ XIX СТАГОДДЗЯ

**Н. Л. Бахановіч**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*вул. Сурганава 1, к. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, Natali_ja@mail.ru*

Гаворыцца пра змены ў мастацкай свядомасці творчай інтэлігенцыі на тэрыторыі Беларусі і Польшчы ў другой палове XIX ст. Грамадства ажыццяўляе радыкальную пераацэнку каштоўнасцей, заручыўшыся падтрымкай запатрабаванага ў той час пазітызму як філасофіі і светапогляду, што садзейнічае кардынальнай змене і кірунку гістарычнага развіцця і характару літаратурнага працэсу. У выніку паступовага мэтаскіраванага адмаўлення эліты ад ідэалізацыці мінулага і засяроджання на рэальным чалавеку і яго патрэбах адбываецца нараджэнне новага героя. Нягледзячы на гістарычна абумоўленую меншую праяўленасць гэтых з'яў у айчынным грамадска-культурным жыцці ў другой палове XIX ст., у параўнанні з польскім, пісьменнікі адчуваюць павевы часу і прадбачваюць будучыя пераўтварэнні пачатку XX ст., здзейсненыя на хвалі Адраджэння.

***Ключавыя словы:*** светапогляд; метадалогія; пазітывізм; чалавек; беларуская літаратура; польская літаратура.

# МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЙ СДВИГ В БЕЛОРУССКОЙ И ПОЛЬСКОЙ ЛИТЕРАТУРАХ XIX ВЕКА

**Н. Л. Баханович**

*Кандидат филологических наук,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы*
*Национальной академии наук Беларуси,*
*ул. Сурганова 1, к. 2, 220072, г. Минск, Беларусь, Natali_ja@mail.ru*

Говорится об изменениях в художественном сознании творческой интеллигенции на территории Беларуси и Польши во второй половине XIX в. Общество осуществляет радикальную переоценку ценностей, заручившись поддержкой востребованного в то время позитивизма как философии и мировоззрения, что содействует кардинальному изменению и направлению исторического развития и характера литературного процесса. В результате постепенного целенаправленного отрицания элиты от идеализацити прошлого и сосредоточения на реальном человеке и его потребностях происходит рождение нового героя. Несмотря на исторически обусловленную меньшую проявленность этих явлений в отечественной общественно-культурной жизни во второй половине XIX в., по сравнению с польским, писатели чувствуют веяния времени и предвещают будущие преобразования начала XX в., совершенные на волне возрождения.

***Ключевые слова:*** мировоззрение; методология; позитивизм; человек; русская литература; польская литература.

## WORLDVIEW AND METHODOLOGICAL SHIFT IN BELARUSIAN AND POLISH LITERATURE OF THE END OF THE 19TH CENTURY

**N. L. Bahanovich**

*PhD, Ass. Professor,*
*Research Center of Belarusian Culture, Language and Literature*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*Surganova av. 1 / 2, 220072, Minsk, Belarus, Natali_ja@mail.ru*

The article talks about changes in the artistic consciousness of the creative intelligentsia in Belarus and Poland in the second half of the 19th century. Society carries out a radical reassessment of values, gaining support for positivism, which was in demand at that time, as a philosophy and worldview, which contributes to a radical change in the direction of historical development and the nature of the literary process. As a result of the elite's gradual purposeful rejection of the idealism of the past and focusing on the real person and his needs, a new hero is born. Despite the historically determined lower manifestation of these phenomena in the national social and cultural life in the second half of the 19th century, compared to the Polish one, the writers feel the mood of the times and anticipate the future transformations of the beginning of the 20th century, carried out on the wave of the Renaissance.

***Keywords:*** worldview; methodology; positivism; a person; Belarusian literature; Polish literature.

XIX стагоддзе ў гісторыі называюць доўгім, і кожны даследчык укладвае ў гэтае вызначэнне сваё разуменне. Калі гаварыць пра літаратуру, то працягласць можна асацыяваць хаця б з тым, што за адносна невялікі час былі народжаны і ў многім пройдзены тры самастойныя светапоглядна-метадалагічныя сістэмы, якія фармавалі аблічча мастацтва слова. Апроч таго, і рамантызм, і рэалізм, і мадэрнізм у пэўным сэнсе былі падрыхтоўкай да грамадска-эканамічнай і культурна-палітычнай парадыгмы наступнага стагоддзя. Не адмаўляючы ў значнасці эстэтыцы кожнай з гэтых сістэм, звернем увагу на тую з іх, што прывяла да нараджэння новага героя – простага чалавека, які стане цэнтрам літаратуры і гісторыі ў XX ст. Пасля паўстанняў 1830–1831 гг., а затым 1863–1864 гг., стымуляваных рамантычным светапоглядам з яго ідэяй змагання, пасля звязанага з паразай грамадскага расчаравання вызначальным зрухам для беларускага і польскага народаў, які прадвызначыў змены ў літаратуры і паўплываў на набліжэнне новай, мадэрнай эпохі, з'яўляецца адмаўленне ад ідэалізацыі старога шляхецкага свету. Традыцыя, запачаткаваная рамантыкам А. Міцкевічам, істотная на працягу ўсяго XIX ст., а для асобных польскіх аўтараў і ў першай палове XX ст. (М. Ванькoвіч, А. Юрэвіч і інш.), усё ж губляе значнасць. Становіцца відавоч-

най неактуальнасць ідэі вяртання Рэчы Паспалітай, усвядомленая са спробай аб’ектыўнага погляду на пытанні гісторыі. Па меры разгортвання сацыяльнавызваленчых і нацыятворчых рухаў паволі адбываецца адмаўленне ад жыцця ва ўладзе ілюзій і паварот да рэальных праблем свайго часу.

Нягледзячы на тое, што традыцыя апявання мінулага ў дзвюх літаратурах дэактуалізуецца па-рознаму, аднолькава ажыццяўляецца радыкальная змена курсу і грамадства, і мастацтва: погляды скіроўваюцца ў супрацьлеглым звыкламу і зразумеламу напрамку ідэалізацыі і прагі ўзнаўлення былога – у бок будучыні. Падкрэсліваючы важнасць гэтага моманту, польскі даследчык П. Херц адзначае, што «пэўныя пісьменнікі не перайшлі з засценка “пана радцы” да аднолькава шляхетнага засценка “сучаснай” багемы, але стварылі чарговую эпоху ў літаратуры і польскай думцы. Можна гэту эпоху любіць, можна яе не пераносіць, але не можна яе значэннем грэбаваць» [1, с. 288]. Ды і само высакароднае саслоўе як сацыяльная група, якая была носьбітам ідэі вяртання Рэчы Паспалітай, пакутліва перажывае этап гістарычнай ломкі, справакаваны, з аднаго боку, «разборамі» шляхты, з іншага – яе няздольнасцю арыентавацца ў рэчаіснасці – быць лідарам у новых сацыяльна-эканамічных і культурных умовах. У выніку на хвалі часу, яго магчымасцей і патрэб, жыццё пачынаюць тварыць прадстаўнікі народа (унутры яго якраз пачынаецца грашова-маёмаснае расслаенне), якія стагоддзямі лічыліся ніжэйшымі па статусе (хоць якраз былі найбольш працаздольнымі і вынослівымі). Цяпер яны пачынаюць атрымоўваць слова і набываць грамадскую, а неўзабаве і грамадзянскую вагу. Раней селянін як і выхадзец з іншых непрывілегіяваных саслоўяў, успрымаўся, паводле польскага даследчыка С. Пігоня, «без своеасаблівай унутранай квінтэсенцыі, якая б акрэслівага яго каштоўнасць – ацэньваўся толькі паводле карыснасці, паслужлівасці. Паводле гэтага таксама, у залежнасці ад той функцыі, якую выконваў, ён атрымліваў прозвішча» [2, с. 247]. У другой палове XIX ст. у грамадска-культурнай сферы заўважаецца светапоглядна-метадалагічны зрух – усведамленне неабходнасці камунікаваць з селянінам як з паўнавартаснай духоўнай асобай са сваімі жаданнямі і патрэбамі.

Ключавую ролю ў рэалізацыі гэтага зруху, у тым ліку ў літаратуры, пачынае выконваць пазітывізм: філасофскі кірунак распаўсюджваецца настолькі, што становіцца самастойным і ўсеахопным грамадска-культурным рухам. На ўзроўні праграмы развіцця менавіта ў літаратуры пазітывізму, ідэі якога ўвасабляліся пасродкам творчых метадаў рэалізму і, у меншай ступені, натуралізму, ніжэйшае саслоўе і яго герой са сваімі клопатамі ставіцца ў цэнтр твораў. У польскім мастацтве слова адным з рэалізатараў пазітывісцкіх ідэй і аўтараў грамадскай праграмы выступае творца беларуска-польскага памежжа Э. Ажэшка, якая, жывучы на працягу доўгага часу ў Гародні, увасабляе ў творах вяскоўца-беларуса. Пісьменніца акцэнтуе ўвагу на яго ўзорных маральных якасцях – індывідуалізуе паводле этычнага крытэрыю, робячы тым самым гэтак званыя польскія «крэсы» прасторай маралі. Паварот да селяніна ў канцы XIX ст., распачаты польскай літаратурай, захапіў і беларускую: яна ўсё болей афармляецца як самастойная, дзякуючы прысутнасці айчыннага кампанента, носьбітам якога якраз і быў вясковец, у польскамоўных мастацкіх тэкстах і з’яўленню беларускамоўных. Апроч спадчыны Э. Ажэшкі, Ю. Крашэўскага і іншых аўтараў, дзе шырока прадстаўлены айчынны дыскурс у выглядзе мясцовых рэалій, селянін

знаходзіцца ў цэнтры беларускамоўных твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча.

Гісторыю беларускай думкі звычайна мала звязваюць з пазітывізмам, хоць, калі паразважаць, яго прысутнасць была б цалкам лагічнай. Карані пазітывісцкага светапогляду ў гісторыі нашай краіны глыбейшыя, чым традыцыйна ўяўляецца, зрэшты, як і ў суседзяў: пачынаючы з рамана «Пан Падстоліц» (1831–1833) Э. Масальскага з прапанаванымі ў ім ідэямі рэарганізацыі сістэмы гаспадарання і ладу жыцця, працягваючы апісаннямі напрыканцы рамана «Полацкая шляхта» (1885) В. Савіча-Заблоцкага, дзе гаворыцца пра пабудову фабрыкі, пашырэнне адукацыі сярод сялянства і развіццё асобы з апорай на дакладныя навукі, заўважная ідэя нясення прагрэсу народу. Гэта і ёсць не што іншае, як увасабленне так званай тэорыі «малых спраў», «арганічнай працы», «працы ў асновах». Калі ж гаварыць пра развагі ў паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» (1898) Я. Лучыны, то гэта ўжо спроба крытычнага разумення наступстваў пазітывізму, не ва ўсім станоўчых для чалавека. Хлапаманства, хаджэнне ў народ у тагачаснай жыццёвай практыцы, рэалізаванае ў мастацтве слова, напрыклад, у матыве вяртання на радзіму адлучаных ад народа шляхецкіх сыноў, якія марнуюць грошы за мяжой («Ідылія» (1842–1844) В. Дуніна-Марцінкевіча), нясе адбітак пазітывізму. М. Гарэцкі называе аўтара п’есы паводле ідэалогіі «добрым беларускім шляхціцам-хлопаманам, узгадаваным на ўлонні беларускай прыроды» [3, с. 236], абвінавачваючы, што «глыбей закрануць сялянскае жыццё не дазваляла яму сацыяльная несвядомасць, боязнь нападаў з боку паноў і праследаванняў з боку царскага рэжыму» [3, с. 237]. Калі гаварыць пра перыяд нацыянальнага Адраджэння пачатку XX ст., то ледзьве не ўся нашаніўская літаратура з вобразам мужыка ў цэнтры і імкненнем асэнсавання яго як годнай і вартай асобы, уяўляе сабой наступства папярэдніх светапоглядна-метадалагічных змен, падмацаваных новымі рэаліямі мадэрнага часу з яго навукова-тэхнічнымі дасягненнямі, сацыяльна-эканамічнымі навацыямі і грамадска-палітычнымі канцэпцыямі. Калі прыгледзецца, размовай людзей пазітывісцкага і мадэрнісцкага светапоглядаў з’яўляецца дыскусія ў нашаніўскай прэсе, асноўным пытаннем якой было, ці мае права чалавек аддавацца ва ўладу хараству і песціць яго ў душы, калі радзіма патрабуе самаадданага служэння ў выглядзе практычных дзеянняў.

Рэалізацыя згаданага светапоглядна-метадалагічнага зруху ў беларускай і польскай літаратурах, як і станаўленне новага героя ў іх, па-рознаму ўспрымаецца даследчыкамі дзвюх краін. У свой час вялікае ўражанне на беларускіх літаратуразнаўцаў зрабіла інтэрпрэтацыя польскім гісторыкам Р. Радзікам дзвюх суседніх літаратур як квінтэсенцый «сялянскай» (у беларускай) і «шляхецкай» (у польскай) этыкі [4]. Асноўнай падставай для такіх заключэнняў стала адмаўленне панства ў паэме «Новая зямля» Я. Коласам, дзе гэта саслоўе паўстае як увасабленне старога ладу і сімвал прыгнёту мацнейшым слабейшага. Р. Радзік бярэ пад увагу і паходжанне нашаніўцаў, з якім звязвае схільнасць выказвацца ад імя мужыка ды адмаўляць высакароднаму саслоўю ў годнасці і вартасці. Не адмаўляючы трагічнай разарванасці пануючага і залежнага саслоўяў у айчыннай гісторыі, беларускае мастацтва слова ўсё ж магло б мець іншае аблічча, калі б не выключанасць цэлага рэцэптыўнага пласта –

польскамоўнай прозы Беларусі XIX ст. Вернутая сёння да свайго чытача, яна пасту-пова ліквідуе ўспрыманне радаводу культурнай спадчыны беларусаў як выключна сялянскага (хоць само па сабе апошняе зусім не лічыцца недахопам, як і ў многіх іншых народаў). Заўважны і высакародныя карані Я. Купалы – адсюль у нечым прывабны вобраз Адольфа Быкоўскага ў «Паўлінцы» і такая адухоўленая паэзія. Розніца літаратур не ў наяўнасці ці адсутнасці пэўнага героя з адпаведным светапоглядам і ідэалогіяй ці нейкай ідэі, тэндэнцыі, а хутчэй у станаўленні іх у якасці магістральных. І ў гэтым адметнасць беларускага нацыянальнага шляху ў гісторыі, у якім было, калі ахапіць папярэдняе XIX ст., усё: і высакароднасць, і сялянскасць, і прага мінулага, і паварот да мадэрнай будучыні, у вялікай ступені здзейснены чалавекам шырокага далягляду і еўрапейскага ўзроўню мыслення Ф. Багушэвічам.

Сялянская этыка і сялянская карціна свету не з'яўляюцца для літаратуры нашых суседзяў вызначальнымі ў святле яе вялікай праблемна-тэматычнай разнастайнасці. Але даследаванні паказваюць, што карані вясковай прозы XX ст., якая ўтварае самастойную плынь і ў польскай літаратуры першай паловы XX ст., варта шукаць якраз у творах канца XIX – пачатку XX ст., пачынаючы ад літаратуры пазітывізму [5]. Не бачыць у польскім мастацтве слова супрацьстаяння панскага і сялянскага светапоглядаў ці міжсаслоўных сутычак немагчыма. Для творчасці выхадцаў са збяднелай шляхты, тым больш з вяскоўцаў, не чужыя праблемы працы на зямлі, недахопу грошай і галечы, неабходнасці плаціць падаткі, залежнасці ад прыродных умоў і інш. Апавяданні «Томэк Баран» («Tomek Baran») (1897), «Сука» («Suka») (1897), «Справядліва» («Sprawiedliwie») (1899), «Орка» («Orka») (1919) У. Рэйманта паказваюць наяўнасць канфлікту паміж пануючым і бяспраўным класамі – выкрыццё шляхецкага саслоўя не чужое польскаму мастацтву. Высокі ўзровень раскрыцця падобнай тэматыкі паказваюць творы «Прыцемкі» («Zmierzch») (1892) і «Забыццё» («Zapomnienie») (1895) С. Жэромскага. Толькі прыведзеныя прыклады пазбаўляюць польскую літаратуру арэолу абсалютнай павагі да шляхецкага саслоўя, таму што само акцэнтаванне праблем залежнага класу ўказвае на тых, хто валадарыць і прымае рашэнні. Тэмай безвыходнасці жыцця селяніна прасякнута творчасць Э. Ажэшкі, А. Дыгасіньскага, Г. Запольскай.

Спачатку ў польскім грамадска-культурным жыцці крытыка панства не ўхвалялася, пра што сведчаць хаця б нападкі на Г. Сянкевіча ў прэсе за непрыгляднае аблічча выскароднага саслоўя ў цыкле апавяданняў «Эскізы вуглём» («Szkice węglem») (1876). Гэта не столькі сведчыць пра адметнасць польскай ментальнасці, у прыватнасці дамінаванне «шляхецкай» этыкі ў іх літаратуры, колькі з'яўляецца наступствам часавага несупадзення ў распаўсюджанні з'явы: у поўнай меры герой-селянін прыйшоў у літаратуру Беларусі ў пачатку XX ст. Новае – грамадская ідэалогія, светапогляд, літаратурныя метады, героі – пакутліва прабівала сабе шлях, як гэта і бывае, таму польскія суседзі ў гэтых адносінах пракладвалі дарогу і сабе, і нам. Ключавую ролю тэма вясковага жыцця іграе ў аўтараў, звязаных з Карпатамі, напрыклад ва У. Оркана. Ураджэнец і жыхар тых мясцін, селянін, ён піша пра цяжкае жыццё мясцовых ратаяў. Твор "Пракляцце" («Przekleństwo») (1900) – польскі празаічны адпаведнік паэмы «Адвечная песня» (1908) Я. Купалы.

Асабліва падобныя апісанні селяніна ў творах «На абрыве (II)» («Nad urwiskiem (II)») (1900) У. Оркана і «Паўлюковы думкі» (1907) Я. Коласа. Польская мініяцюра змешчана ў аднайменным зборніку «На абрыве» («Nad urwiskiem»), дзе пануе атмасфера чалавечага болю, звязанага з гаротным жыццём, непасільнай працай і безвыходнасцю. З апавядання паўстае тыповы партрэт «скамянелага» ў сваім мусульманскім спакоі тыповага жыхара падкарпацкай вёскі: «*З вузенькага акна ў нізкай хаціне каля лесу высунулася валасатая чорная сялянская галава... Глыбока запалыя вочы, як вочы земляной палёўкі, з дзіўнай упартасцю глядзяць навокал. У гэтай душы ёсць падаўленая сіла, якая глядзіць на свет вачыма; ёсць нейкі вечны, затоены боль, што застыў на сухім маршчыністым твары, а вераб'іны нос, рэзка выгнуты, выдае непрыхаваную драпежнасць, змякчаную высокім і наморшчаным ілбом. Пазнаеш па рухомых бровах і ілбе першабытнага мысляра, якому баліць уласнае невуцтва і які, адчуваючы сваю мізэрнасць перад вялікімі сіламі, грызе сябе таемнай злосцю і бяссільным гневам*»[1] [6, с. 70]. Атмасфера трывогі і страху за будучыню, выяўляючы стан душы жыхара польскай вёскі, дамінуе ў зборніку У. Оркана.

Прыкладна праз сем гадоў беларускі пісьменнік Я. Колас стварае ў мініяцюры «Паўлюковы думкі» вобраз сялянскага героя, якія тыпалагічна суадносіцца з выяўленым У. Орканам: «*Вунь відаць мужыцкая вёска. Зліліся ў кучу хаты і гумны. Праз гнілыя саламяныя стрэхі льецца вада. Вокны забіты, заложаны лучынаю, усякім рыззём. У хаце сырасць, гразь. Па кутках павуцінне: дым, чарната, смурод. На двары – павярнуцца нельга. Ходзіць мужык расхлістаны, у лапцях, чорны, як камінар, з мазалямі. Не знае ён ніколі спакою. Мокне ў дождж на полі, на лузе, прышчыцца на сонцы. Горкі пот залівае яму вочы. Мерзне зімою ў хаце. Есць – як папала. У хлеб падсыпае мякіну, есць нішчымны квас і зацірку. Яго ўсякі гоніць, усякі ўшчувае. Забілі мужыка, скалечылі яго душу, адабралі ад яго вобраз твой, Божа!*» [7, с. 22]. Замест злосці і бяссілля, уласцівых герою У. Оркана, беларускі аўтар надзяляе Паўлюка смеласцю падумаць пра тое, чаму ўсё так несправядліва ўладкавана ў чалавечым свеце, у параўнанні з жывёльным, і нават усумніцца ў правільнасці прапанаванай рэлігіяй і духавенствам карціне свету.

Пасля расчаравання ў рамантычных ідэалах пазітывісцкія істотна спрыяюць здзяйсненню кардынальнага светапоглядна-метадалагічнага зруху, вызначальнага для далейшага развіцця і літаратуры, і грамадства. Таму вобраз селяніна і не быў цалкам адрынуты наступнай генерацыяй – мадэрністамі, нягледзячы на ўласцівы ёй індывідуалізм і імкненне да стварэння сацыяльна не абцяжаранага мастацтва.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Hertz P.* Ład i nieład / P. Hertz. Warszawa : Państ. Inst. Wydaw., 1964.

2. *Pigoń St.* Na drogach kultury ludowej : rozprawy i studia / wyb. i opracow. T. Judełki-Burzeckiego. Warszawa : Lud. Spółdz. Wydaw., 1974. 666 s.

[1] Пераклад з польскай мовы аўтара артыкула. – Н.Б.

3. *Гарэцкі М.* Беларускі тэатр у палове XIX веку ; прадм. Н. Гілевіча, пасл. Т. Голуб // Вобраз : літ.-крытыч. арт. ; склад. Т. Грамадчанка ; рэдкал. : Н. Пашкевіч (рэд.) і інш. Мінск : Маст. літ., 1988. С. 224 – 243.

4. *Радзік Р.* «Новая зямля»: вобраз грамадства ў паэме Якуба Коласа // Беларусь і Беларусы ў прасторы і часе : зб. да 75-годдзя праф. А. Мальдзіса ; пад рэд. С. Запрудскага [і інш.]. Мінск , 2007. С. 291–296.

5. *Цыбенко О. В.* Литературные истоки польской деревенской прозы [Электронный ресурс] // КиберЛенинка.. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/literaturnye-istoki-polskoy-derevenskoy-prozy/viewer (дата обращения : 20.09.2024).

6. *Orkan W.* Nad urwiskiem. Szkice i obrazki . Kraków : Druk W. L. Anczyca i Spółki, 1900.

7. *Колас Я.* Збор твораў : у 20 т. Мінск : Беларус. навука, 2008. Т. 5 : Апавяданні (1906–1924) / [рэд. З. У. Драздова].